Да 1 кастрычніка 1939 г. Чырвоная армія, не панесшы вялікіх стратаў цалкам выканала пастаўленыя задачы і вызваліла тэрыторыю Заходняй Беларусі.

У выніку гэтай акцыі Савецкі Саюз атрымаў пэўны час для ўмацавання сваёй абараназдольнасці напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

***Літаратура:***


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.] – Мінск: БелЭн, Гімназіі – Кадэнцыя. – Т. 3. - 1996. – 527 с.
2. Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: матэр. міжнар. навук.-тэарэт. канфер., Мінск 17-18 верасня 1999 г. / БДУ; адк. рэд. П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў. – Мінск, 2000. – 333 с.
3. История второй мировой войны 1939–1945 гг. : в 12 т. / редкол.: Р.Р. Бысюк, Г.К. Киселев, А.П. Кондак [и др.] – Москва: Воениздат, Т. 2. - 1974. – 1982.
4. Lisewski K. Wojna polsko-sowiecka 1939. Londyn.1988.
5. Памяць: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Брэст. У 2 кнігах. Кніга 1. – Мн., 1997.



Л.Ю. Малыхина г. Брест


## ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1918–1919 гг.

У бягучым 2008 г. мы адзначаем 90-годдзе стварэння Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Дазвольце прыцягнуць вашу увагу да гісторыі вайсковых злучэнняў на тэрыторыі Беларусі ў паслякастрычніцкі перыяд. Фарміраванне воінскіх часцей, якія пазней увайшлі ў Чырвоную Армію Савецкай Расіі на тэрыторыі беларускіх гарадоў пачалося яшчэ ў першыя дні Кастрычніцкай рэвалюцыі. Згодна з ўспамінамі сучасніка падзей В.Г. Кнорына, 25 кастрычніка 1917 г., у $12^{00}$ гадзін, атрымаўшы тэлефанаграму з Петраграда аб перамозе рэвалюцыі, Прэзідыум Мінскага Савета выдаў свой прыказ № 1 да насельніцтва, згодна з якім да $14^{00}$ гадзін перад будынкам Савета на вул. Петраградскай, № 6 пачалі выстраівацца вызваленыя з турмаў і гаўптвахт палітычныя арыштаваныя, салдаты фронта, бальшавікі (прыкладна колькасцю 1000 чалавек). Яны ўжо ў турме, пад кіраўніцтвам прапаршчыка Рэмнёва самаарганізаваліся ў воінскую адзінку, разбітую на роты, узводы і аддзяленні, і асноўнай задачай на гэты дзень стала атрыманне зброі. Тым часам члены Выканкама Мінскага Савета паспелі ўжо канфіскаваць з артылерыйскіх складоў неабходную колькасць вінтовак, кулямётаў і амуніцыі. У хуткім часе зброя была раздана, сфарміраваны 1-ы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета, які павінен быў абараняць савецкую ўладу. Гэта быў першы крок да стварэння часцей Чырвонай Арміі ў Заходняй вобласці.[1] Для распаўсюджання савецкай улады на ўсю Беларусь і фронт 26 кастрычніка, ўвечары, было вырашана ўтварыць Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняй вобласці і фронта на чале з А.Ф. Мясніковым (Мяснікянам).

---

[1] Заходняя вобласць – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка РСФСР з цэнтрам у Смаленску, куды была ўключана тэрыторыя такіх беларускіх губерній як Смаленская, Віцебская, Магілёўская і Мінская.

У рэвалюцыйным 1917 г. на тэрыторыі Беларусі – прыфрантавой зоне Першай сусветнай вайны, знаходзілася паўтарамільённая армія Заходняга фронту, а таксама Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве. Раней, чым у астатніх злучэннях Заходняга фронту, барацьба за ўсталяванне рэвалюцыйнага парадку разгарнулася ў часцях і падраздзяленнях 2-й арміі (цэнтрам дыслакацыі якой быў Несвіж). З 26 кастрычніка ВРК пачаў рыхтаваць рэвалюцыйны пераварот у штабе гэтай арміі, што і зрабіў з дапамогай 32-га Сібірскага палка. Пачаліся перавыбары дывізіённых і карпусных камітэтаў і перадача ім усёй улады ў арміі.

1 лістапада 1917 г. у Мінск прыбылі атрады рэвалюцыйных салдат 2-й арміі, а таксама браніраваны цягнік на чале з бальшавіком У. Пралыгіным, членам ВРК 2-й арміі. Хутка да горада таксама былі накіраваны зводны атрад салдат 2-й Сібірскай дывізіі, 1-ы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета і іншыя вайсковыя часці з фронту. Іх прыбыццё змяніла суадносіны сіл на карысць бальшавікоў – 2 лістапада было аб'яўлена аб устанаўленні савецкай улады ў Мінску. ВРК Заходняга фронту ўзяў усю ўладу ў свае рукі і стаў найвышэйшым паўнамоцным органам улады на свабоднай ад немцаў тэрыторыі Беларусі. Апошнім беларускім горадам, дзе перамагла савецкая ўлада, быў Магілёў. Для ліквідацыі Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, вакол якой былі сканцэнтраваны контррэвалюцыйныя арганізацыі, Савецкі ўрад прыняў шэраг рашучых мер:

- прызначыў новым галоўнакамандуючым М. Крыленку;
- накіраваў з Петраграда салдат Літоўскага палка, матросаў Балтыйскага флоту;
- ВРК Заходняга фронту сфарміраваў атрад з салдат 1-га палка імя Мінскага Савета, а таксама рэвалюцыйныя атрады з іншых гарадоў Беларусі.

З 20 лістапада ў Магілёве пачала дзейнічаць савецкая ўлада. У гэты ж дзень, 20 лістапада 1917 г. адкрыўся II з'езд армій Заходняга фронту, галоўнакамандуючым войскамі Заходняга фронту з'езд прызначыў А.Ф. Мяснікова [1, с. 23].

Цікава заўважыць, што ў апублікаванай ў 2005 г. зборніку дакументаў і матэрыялаў "1 января 1919 г..." Дакладной запісцы ў Маскву "Савецкая ўлада ў Беларусіі", аўтарства якой дакладна не вызначана, змяшчалася заўвага, што ў снежні 1917 г. "беларускіх войскаў увогуле не было, паколькі Глаўказап Мяснікоў забараніў іх фарміраваць" [2, с. 214].

Трэба прызнаць, што спробы стварыць уласнае нацыянальнае войска рабіліся. У пачатку лістапада 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд беларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронту з удзелам прадстаўнікоў Балтыйскага флоту, Паўднёва-Заходняга, Румынскага і Паўночнага франтоў. На з'ездзе была створана Цэнтральная беларуская вайсковая рада Заходняга фронту на чале з С. Рак-Міхайлоўскім. Галоўнай задачай ЦБВР лічыла стварэнне беларускага войска, але пастаўленай мэты так і не дабілася. І гэта фактычна азначае, што большая частка вайсковых фарміраванняў Заходняга фронту паступова ўваходзіла ў адзіную Чырвоную Армію.

15 студзеня 1918 г. СНК РСФСР быў прыняты дэкрэт аб арганізацыі добраахвотнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі з грамадзян не маладзей за 18 год з рэкамендацыямі. Пры ўступленні цэлымі часцямі патрабавалася кругавая парука ўсіх і паімённае галасаванне [3, с. 356-357]. З 250 тысяч афіцэраў і генералаў царскай арміі да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1918–1920 гг. 75 тысяч чалавек (30 %) змагалася ў Чырвонай Арміі, 40 % – супраць яе [4, с. 36-37].

У другой палове лютага 1918 г., калі пасля зрыву мірных перагавораў у Брэст-Літоўску і наступлення на руска-германскім фронце аўстра-венгерскіх і германскіх дывізій, свабоднымі засталіся толькі 6 паветаў Магілёўскай і Віцебскай губерняў, тысячы рабочых і сялян Беларусі пачалі запісвацца ў Чырвоную армію. Да 22 лютага 1918 г. у Магілёве дабраахвотнікамі запісалася 2 тысячы рабочых – тут быў сфарміраваны полк Чырвонай Арміі. У Віцебскай губерніі колькасць добраахвотнікаў дасягнула амаль 5 тысяч чалавек. Былі створаны чатыры батальёны імя Віцебскага Савета, 1-ы, 2-і гомельскія чырвонагвардзейскія батальёны, Аршанскі конны дывізіён і г. д. 23 лютага 1918 г. адбыліся найбольш масавыя мітынгі і запісы ў армію па ўсёй Савецкай Расіі. У выніку прынятых мер на асобных участках фронту рух ворага быў спынены, а 3 сакавіка 1918 г. падпісаны гістарычна вядомы Брэсцкі мірны дагавор [1, с. 40].

Да сакавіка 1918 г. не існавала адзінага органа кіравання, які б займаўся кіраўніцтвам баявымі дзеяннямі Чырвонай Арміі і адначасова – забеспячэннем абароны краіны. Калегія Народнага Камісарыята па ваенных справах, у складзе якой яшчэ не было ваенных спецыялістаў, з такой роляй не спраўлялася. Таму 4 сакавіка 1918 г. пастановай Саўнаркома РСФСР быў утвораны Вышэйшы Ваенны Савет з падпарадкаваннем яму ўсіх цэнтральных органаў ваеннага ведамства. Гэтай пастановай скасоўвалася пасада Глаўкаверха; распускаўся Камітэт Рэвалюцыйнай абароны. Старшыня ВВС – абавязкова член ЦК РКП(б) – станавіўся адначасова і народным камісарам па ваенных і марскіх справах, ім у хуткім часе быў абраны Л.Д. Троцкі. У ВСС запрашаліся і ваенныя спецыялісты старой арміі, агульная колькасць перайшоўшых сюды складала, па даведках П.А. Шэвацукова, каля 8 тысяч генералаў і афіцэраў [4, с. 27].

На неакупаванай тэрыторыі Беларусі важнейшай задачай партыйных і савецкіх органаў стала дапамога Чырвонай Арміі, павышэнне баяздольнасці чырвонаармейскіх і іншых рэвалюцыйных атрадаў. З гэтай мэтай у пачатку красавіка 1918 г. было створана аператыўнае аб'яднанне асобных атрадаў, куды ўвайшлі Віцебскі, Невельскі, Аршанскі, Рослаўскі, Смаленскі, Бранскі і Курскі атрады. На чале аб'яднанняў стаяў Ваенны Савет, падпарадкаваны ВВС, які ажыцяўляў палітычнае і гаспадарчае кіраўніцтва ўсімі войскамі, што размяшчаліся уздоўж заходняга ўчастка дэмаркацыйнай лініі. Ваенны савет правёў вялікую работу па аб'яднанню часцей і падраздзяленняў, што дзейнічалі на Заходнім фронце. Была ажыццеўлена перагрупіроўка сіл на найбольш важных напрамках, узмоцнены слабыя атрады і часці, удасканалена сістэма кіравання.

У адпаведнасці з дэкрэтам СНК ад 8 красавіка 1918 г. быў створаны новы ваенна-адміністрацыйны апарат: акруговыя, губернскія і валасныя камісарыяты па ваенных справах. На неакупаванай тэрыторыі Беларусі былі ўтвораны 2 губернскія, 15 павятовых і 139 валасных ваенных камісарыятаў. Дзякуючы іх намаганням, напрыканцы 1918 г. ў Віцебскай і Магілёўскай губернях добраахвотнікамі ў Чырвоную Армію запісалася больш як 30 тысяч рабочых і сялян, што склала 5 чырвонаармейскіх палкоў імя Віцебскага Савета, Сенненскі народны полк, 1-ы Мсціслаўскі народны батальён, 1-ы рэвалюцыйны полк Аршанскага Савета. Атрады Чырвонай Арміі былі створаны ў Чавускім, Чэрыкаўскім, Быхаўскім і іншых паветах.

Пашырэнне інтэрвенцыі краін Антанты, актывізацыя унутранай контррэвалюцыі запатрабавалі стварэння рэгулярнай Чырвонай Арміі. У сувязі

з гэтым савецкі ўрад перайшоў ад добраахвотнага прынцыпу яе камплектавання да прызыўной сістэмы. 29 мая 1918 г. УЦВК РСФСР прыняў пастанову аб абавязковай ваеннай службе працоўных у арміі, а 11 чэрвеня Саўнаркам выдаў дэкрэт аб прызыве грамадзян у Чырвоную Армію. На Беларусі першыя мабілізацыі праводзіліся ў ліпені – жніўні 1918 г., калі ў армію было прызвана каля 100 тыс. рабочых і сялян. Аднак сярод часткі сялян назіраліся хістанні, нярэдкімі былі выпадкі ўхілення ад мабілізацыі.

Між тым летам 1918 г. рэзка змянілася міжнароднае становішча. Поспехі Чырвонай Арміі на франтах грамадзянскай вайны вымусілі ўрад Германіі пайсці на тое, каб вывесці войскі з часткі захопленай тэрыторыі. 27 жніўня 1918 г. савецкі ўрад падпісаў з Германіяй дагавор, паводле якога яна пагадзілася вывесці свае войскі з тэрыторыі Беларусі на ўсход да р. Бярэзіны. Аднак ва ўмовах грамадзянскай вайны 2 верасня 1918 г. УЦВК прыняў рашэнне аб аб'яднанні функцый Вышэйшага Ваеннага Савета і Народнага камісарыята па ваенных і марскіх справах у адным органе – Рэвалюцыйным ваенным Савеце (РВС) (старшынёю РВСР да 1925 г. быў Л.Д. Троцкі). У канцы верасня часці Чырвонай Арміі ўступілі на тэрыторыю Лепельскага і Сенненскага паветаў, у кастрычніку былі вызвалены Аршанскі і Магілёўскі паветы. Да сярэдзіны лютага 1919 г. ад нямецкіх акупантаў была ачышчана амаль уся тэрыторыя Беларусі, большая частка Украіны, Эстоніі і Літвы [1, с. 56]. Гэта дазволіла абвясціць 1 студзеня 1919 г. Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку Беларусь.

Днём нараджэння першых асобных беларускіх часцей Чырвонай Арміі безумоўна можна лічыць і дзень, калі быў выдадзены "Маніфест Часовага работніча-сялянскага савецкага правіцельства Беларусі" – 1 студзеня 1919 г., у якім паведамлялася, што: "З гэтага моманту ўся ўласць на Беларусі прыналежыць толькі Саветам работнічых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. ...Чырвонай арміі, рабочым і сялянскай бядноце Беларусі даручае Часовае Правіцельства Савецкай Беларускай незалежнай Рэспублікі ахову ўсіх гэтых заваёў сацыяльнае рэвалюцыі" [2, с. 15-16].

Камісарыят па ваенных справах у Часовым урадзе БССР па прапанове І. Сталіна ўзначаліў А.Ф. Мяснікоў. Аднак працэс фармальнага падзялення Чырвонай Арміі, размешчанай на тэрыторыі Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі на нацыянальныя арміі наваяўленых рэспублік ва ўмовах пагрозы новай вайны так і не быў скончаны. Больш таго, у лютым 1919 г. былі аб'яднаны дзве суседнія савецкія рэспублікі – Літва і Беларусь. Доўгі час лічылася, што галоўнай прычынай аб'яднання двух рэспублік з'яўлялася жорсткая неабходнасць умацавання іх абароназдольнасці з тым, каб вытрымаць узброенае наступленне Польшчы, спыніць яе агрэсію супраць Савецкай Расіі. Аднак тэзіс аб тым, што аб'яднанне двух савецкіх рэспублік па прапанове ЦК РКП(б) выклікалася ваенна-абарончымі меркаваннямі, на наш погляд, не вытрымлівае крытыкі з навуковага пункту гледжання.

Па-першае, ні Беларуская ССР, ні Літоўская Савецкая рэспубліка не мелі сваіх узброеных сіл і ваенна-стратэгічных рэсурсаў. Тыя нешматлікія вайсковыя фарміраванні, што знаходзіліся на іх тэрыторыях пасля адыходу кайзераўскіх акупантаў і ўступлення Чырвонай Арміі, падпарадкоўваліся яе цэнтральнаму галоўнакамандаванню – РВС. Камандуючыя Заходнім фронтам, створанага 19 лютага 1919 г., прызначаліся вышэйшым партыйна-савецкім і ваенным кіраўніцтвам РСФСР і былі адказныя перад ім. Ваенны камісарыят Літоўска-Беларускай ССР не з'яўляўся кіруючым органам абароны. На гэта,

дарэчы, звяртаў увагу яшчэ В.Г. Кнорын у артыкуле «Восемь месяцев Советской Белоруссии», надрукаваным у верасні-кастрычніку 1919 г. у газеце «Звезда». Тады ён пісаў аб тым, што ваенны камісарыят ЛітБела, «не з'яўляючыся органам, які распараджаўся ваеннымі сіламі на фронце, не мог узяць на сябе адказнасці за ход абароны, а потым за цяжкую катастрофу пад Вільняй, якая выявіла ўсе слабыя бакі нашай ваеннай арганізацыі» [5, с. 57].

Па-другое, колькасць штыкоў і шашак на савецкім Заходнім фронце была па сутнасці сімвалічнай. Па дадзеным, якія прывёў літоўскі гісторык Б. Вайткявічус у сваёй манаграфіі «Сацыялістычная рэвалюцыя ў Літве 1918-1919 гг.», суадносіны ўзброенных сіл на Заходнім фронце (у ЛітБеле) былі наступнымі: штыкоў 5:1, шашак 14:1 на карысць польскіх легіянераў [6, с. 667]. У дакладзе галоўнага камандавання ў Рэўваенсавет РСФСР аб становішчы на Заходнім фронце на сярэдзіну чэрвеня 1919 г. паведамлялася наступнае: «Суадносіны сіл нашых і праціўніка на гэтым участку цяперашняга Заходняга фронта былі, увогуле, не на нашу карысць. Усяго на гэтым фронце мы мелі каля 90 тыс. штыкоў і шашак пры 1 941 кулямёце і 677 пушках, супраць 273 тыс. штыкоў і шашак, каля 2 400 куляметаў і каля 750 пушак у праціўніка» [7, с. 371]. На тэрыторыі ЛітБела ў чэрвені 1919 г. налічвалася ўсяго 17 450 чырвонаармейцаў (пяхоты і конніцы), а ў польскім войску – 96 150 легіянераў [8, с. 329].

Яшчэ горшым было матэрыяльна-бытавое забеспячэнне савецкіх войск, якія знаходзіліся на Заходнім фронце. Так, на 1 лютага 1919 г. у войсках фронта запасаў прадуктаў было: мукі – на тры дні, мяса і рыбы – на пяць, гародніны – на шэсць дзён. Яно не палепшылася і ў будучым. 18 ліпеня 1919 г. Савет Абароны Літоўска-Беларускай ССР накіраваў старшыні СНК РСФСР У.І. Леніну тэлеграму наступнага зместу: «Цяперашняе становішча на фронце з прадуктамі вельмі дрэннае. На базах ні фунта хлеба. У часцях – таксама» [9, с. 115].

Такое нікуды не вартае забяспячэнне войск Заходняга фронта ўплывала на яго баяздольнасць і маральна-баявы дух. Прадстаўнік ЦК РКП(б) у Беларусі А.А. Іофэ 28 студзеня 1919 г. у лісце Я.М. Свярдлову даводзіў: «...Нашы войскі, якія тут знаходзяцца, па агульнай ацэнцы, ні чорту не вартыя, часткаю выклікаюць боязь, што пабягуць пры першым выстрале», іншыя «настолькі разбэшчаныя, што рабуюць мясцовае насельніцтва горш за татар» [10, с. 2].

Увогуле ўзброеныя сілы Чырвонай Арміі, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі і Літвы, значна ўступалі войскам Польшчы. І гэты факт прызнаюць як беларускія, так і літоўскія гісторыкі. Але справа была не толькі ва ўзброенных сілах. Сам урад ЛітБела ўтрымліваўся на грошы Масквы. У адным з дакументаў Наркамата фінансаў Літоўска-Беларускай рэспублікі гаварылася, што з часу яго ўтварэння і да захопу палякамі Вільні 21 красавіка 1919 г. ён атрымаў з РСФСР 200 млн. рублёў, не ўлічваючы сумаў, якія атрымалі асобныя камісарыяты на спецыяльныя патрэбы. Бюджэт ССР ЛіБ зацвярджаўся СНК РСФСР, фінансаванне рэспублікі ажыццяўляла Савецкая Расія [11, с. 152].

Далей. Кіраўніцтва РСФСР добра валодала становішчам на франтах грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі. І ў 1919 г. галоўныя сілы Чырвонай Арміі былі сканцэнтраваны на Усходнім і Паўднёвым франтах, на якіх вырашаўся лёс савецкай рэспублікі і бальшавіцкай улады. У тых умовах Савецкая Расія не змагла аказаць больш-менш істотную ваенную дапамогу Літоўска-Беларускай ССР. Ратаваць становішча трэба было, як бачым, іншымі сродкамі. І размова ж ішла, зразумела, не аб інтарэсах БССР і Літоўскай ССР, якія з'явіліся на палітычнай карце Еўропы па загаду з Крамля, а аб гамлетаўскім быць ці не быць Савецкай Расіі, Савецкай уладзе. Уся стратэгія і

тактыка кіраўніцтва РСФСР была падпарадкавана адной адзінай мэце – усімі сродкамі выратаваць і захаваць сваю бальшавіцкую ўладу. Гэта абумовіла і розныя дыпламатычныя, знешнепалітычныя, нацыянальна-дзяржаўныя і іншыя маніпуляцыі. Адсюль, хутчэй за ўсё, і ўзнікла ідэя стварэння выратавальнага буфера – аб'яднанай штучнай дзяржавы ў выглядзе Літоўска-Беларускай ССР.[2] Але для іншых мэтаў, таму што для ўмацавання абараназдольнасці рэспублік, як бачым, не было чаго аб'ядноўваць.

Больш таго, не можа не ўзнікнуць лагічнае пытанне – калі на самой справе размова ішла аб сапраўдным умацаванні абараназдольнасці савецкіх рэспублік на Захадзе Савецкай Расіі, то чаму аб'яднанне было зроблена з урэзанай Беларускай ССР, а не ў поўным складзе? У такім выпадку «буфер» быў бы мацнейшым.

Калі ж «буфер» ствараўся для таго, каб перагарадзіць шлях польскаму наступленню на краіну Саветаў, то навошта ж было сталіцу ЛітБела размяшчаць у Вільні? У ваенна-стратэгічных адносінах на такую ролю больш падыходзіў Мінск, які быў акупаваны польскімі легіянерамі на тры з паловай месяцы пазней, чым Вільня, якая была здадзена захопнікам ужо 21 красавіка 1919 г.

Такім чынам, аргументацыю аб тым, што аб'яднанне савецкіх Літвы і Беларусі ў студзені – лютым 1919 г. быццам бы выклікалася неабходнасцю ўмацавання абараназдольнасці – сучасныя даследчыкі не выкарыстоўваюць. Рашаючай прычынай штучнага стварэння новай дзяржавы былі знешнепалітычныя абставіны і міжнароднае становішча, якое склалася для Савецкай Расіі. Вялікае значэнне для арганізацыі адпору інтэрвентам мелі пастановы ЦВК Украіны, Літвы і Беларусі, прынятыя ў маі 1919 г. аб неабходнасці ваенна-палітычнага саюза. На аснове гэтых дакументаў ЦВК Расіі прыняў 1 чэрвеня 1919 г. пастанову аб аб'яднанні ваенных сіл савецкіх рэспублік. Стварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у снежні 1922 г. завершыла фарміраванне цэнтралізаванай структуры Чырвонай Арміі.

Трэба дакладна ўяўляць, што святкаванне 23 лютага - Дня абаронца Айчыны толькі падкрэслівае пераемнасць ёю традыцый Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, значна пазней – Савецкай Арміі СССР і не ўмяшчае нацыянальнага кантэксту.

### *Літаратура:*


1. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997 г.: Вучэб. дапам. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 1998.
2. 1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии: док. и материалы / Сост. В.Д. Селеменев (рук.) [и др.]; науч. ред. М.Ф. Шумейко. – Мн., 2005.
3. Декреты Советской власти. – М., 1957., Т. 1.
4. Шевоцуков П.А. Страницы истории гражданской войны: взгляд через десятилетия. – М., 1992.
5. Кнорин В.Г. Избранные статьи и речи. – Мн., 1990.
6. Vaitkevičus B. Socialistine revoliucija Lietuvoje 1918 – 1919 metais. – Vilnius, 1967.
7. Из истории гражданской войны в СССР. Т. 2 (март 1919 г. – февраль 1920 г.). – М., 1961.


[2] Буферная дзяржава – звычайна несамастойная і слабая ў ваенных і палітычных адносінах дзяржава, якая знаходзіцца паміж варагуючымі бакамі. (Гл.: Словарь иностранных слов. 16-е изд. исправл. – М., 1988. – С. 95).

8. История Литовской ССР (с древнейших времён до наших дней). – Вильнюс, 1978.
9. Селиванов П.А. Укрепление тыла Красной Армии: Деятельность Советов и ревкомов Белоруссии (1918 – 1920 гг.). – Мн., 1987.
10. Платонов Р., Сташкевич Н. Трудный путь к свободе // Советская Белоруссия. – 1991. – 16 июля. – С. 2.
11. Куличенко М.И. Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса.

П.С. Романович г. Брест

## КРАСНАЯ АРМИЯ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1919-1920 гг.

В 1919 г. В.И. Ленин с его, по словам Г.В. Чичерина, «бесподобной гибкостью и политическим реализмом» пришел к выводу, что «надо считаться с фактом окончательного образования рядом с нами буржуазных национальных республик. Это был снова поворотный пункт нашей внешней политики», второй после Бреста [10, с. 266–267]. Однако интриги Антанты с целью заставить воевать против Советской России государства – лимитрофы привели к затягиванию гражданской войны. Главным действующим лицом в 1919–1920 гг. выступила Польша, опиравшаяся на поддержку Франции.

Польское правительство стремилось не к восстановлению национально-этнических границ, а к захвату более обширных территорий, которые находились под контролем Польши в моменты ее наибольшего могущества. Наиболее заинтересованной в создании сильной Польши была Франция, которая видела в ней «щит между русским большевизмом и германской революцией». Варшавское правительство сделало ставку на утверждение собственной гегемонии в группировке государств, которая должна была включать также Украину, Литву и бороться против большевизма [4, с. 82-84].

Польское наступление вновь разожгло угасавшую гражданскую войну. Небольшие силы Западной армии обороняли сотни километров фронта в Беларуси. В Западную армию входили: Литовская, Западная, 17-я и 8-я дивизии. Штаб Армии размещался в Смоленске. 13 марта 1919 г. Реввоенсовет РСФСР переименовал Западную Армию в Белорусско-Литовскую [7, с. 43]. В результате февральско-мартовского 1919 г. наступления польские легионеры захватили Брест-Литовск, Волковыск, Слоним, Скидель, Пинск, а в апреле были оккупированы Лида, Барановичи, Вильно. Положение на Западном фронте осложнилось. Красноармейские части 16-й армии (36 тыс. человек) под натиском польских войск (96 тыс.человек) отходили на восток.

По решению ЦК компартии Литвы и Беларуси была проведена мобилизация коммунистов, комсомольцев, рабочих и крестьян в Красную Армию. Мобилизации подлежали граждане от 18 до 40 лет независимо от занимаемого служебного положения и образования. В Минской губернии было мобилизовано 35 тыс. рабочих и крестьян. 40 тыс. человек, мобилизованных в армию в Витебской и Гомельской губерниях были направлены на Западный фронт [5, с. 258]. В 30 км от Минска наступление польских войск было остановлено. 16-я армия вела тяжелые оборонительные бои на подступах к Минску. Главное командование не имело возможности выделить достаточно сил, вооружения, снаряжения вой-